ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 5 (925) | АЎТОРАК, 25 сакавіка 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгранную вучэбна-выхаваўчую дзейнасць, падвіжніцкую і грамадскую работу дацэнт кафедры філасофіі **ГАРАНІНА Тамара Пятроўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.*

***Т.П.ГАРАНІНА** ўзнагароджана таксама Ганаровай граматай універсітэта за шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.*

* * *

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання **БЫХАЎЦАЎ Віктар Емяльянавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*



На гэтым здымку вы бачыце першакурсніка эканамічнага факультэта Гардзея КЛІМАВА, які 13 сакавіка заваяваў ганаровае званне "Містэр універсітэта-97".

Матэрыял аб праведзеным традыцыйным конкурсе чытайце на 7-ай старонцы нашай газеты.

**Фота У.Чысціка.**

## ТЫДЗЕНЬ КАМП'ЮТЭРНЫХ НАВУК

На матэматычным факультэце нашага універсітэта праведзены Тыдзень камп'ютэрных навук (Gomel Computer Science Week/ GCSW'97), да ўдзелу ў якім запрашаліся выкладчыкі, студэнты і школьнікі ўсіх навучальных устаноў г.Гомеля і Гомельскай вобласці, а таксама прадстаўнікі фірм, якія зацікаўлены ў развіцці камп"ютэрных тэхналогій у рэгіёне.

У рамках GCSW'97 адбыліся: алімпіяда па праграміраванню (2 індывідуальныя і 1 камандны туры) для студэнтаў 1-5 курсаў, школьнікаў 10-11 і 7-9 класаў; конкурс праграмных прадуктаў, распрацаваных у Гомелі -- Gomel-Soft'97; прэзентацыі фірм, якія звязаны з камп'ютэрнымі тэхналогіямі; дыскусійны клуб "Перспектывы INTERNET у Гомельскай вобласці"; навукова-метадычны семінар "Камп'ютэрныя тэхналогіі ў адукацыі".

Пераможцамі алімпіяды па праграміраванню сталі першакурснік БелДУТа Андрэй Лагвіненка, вучань 11 класа СШ N9 Арцём Кузняцоў, васьмікласнік СШ N27 Аляксей Данчанка і каманда матэматычнага факультэта нашага універсітэта, за якую выступалі Ігар Ермалаеў (гр. ПМ-24), Ігар Ганчарэнка (гр. ПМ-14) і мяркуемы будучы наш студэнт, ужо ўпамянуты Арцём Кузняцоў.

У конкурсе праграмных прадуктаў прадставілі свае распрацоўкі супрацоўнікі, аспіранты і студэнты матэматычнага факультэта І.М.Зісельман, Я.Ахотнікаў, А.Бабчанка, А.Галацін, К.Вулах.

Асаблівую цікавасць у школьнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта выклікала дэманстрацыя магчымасцей INTERNET, якая адбылася дзякуючы дзейснаму ўдзелу ГП "Белаблтэлекам" і ВКФ "Сервер". Супрацоўнік ГП "Белаблтэлекам" А.Г.Молакаў падрабязна азнаёміў прысутных з перспектывамі распаўсюджання INTERNET на Гомельшчыне і прадэманстраваў рэальную работу ў INTERNET. Кіраўнік ВКФ "Сервер" В.А.Рай (дарэчы, выпускнік матэматычнага факультэта ГДУ) расказаў аб актыўным удзеле сваёй фірмы ва ўкараненні сеткавых тэхналогій апрацоўкі інфармацыі ў г.Гомелі і вобласці. Акрамя таго, яна забяспечыла магчымасць індывідуальнай работы ў INTERNET усіх жадаючых студэнтаў і школьнікаў на працягу трох застаўшыхся дзён GCSW'97.

Ва ўзнагароджанні пераможцаў прынялі ўдзел ВКФ "Сервер", "Белкомдата", "Дэльта-І", за што іх кіраўнікам В.А.Раю, І.Н. Ахраменка і Н.Н.Янычкіну выказваецца вялікая падзяка як ад удзельнікаў алімпіяд, так і ад іх арганізатараў.

Асаблівую ўдзячнасць трэба выказаць тым, хто дапамагаў у правядзенні GCSW'97: аспірантам кафедры ВМ і праграміравання Я.Ахотнікаву і Н.Цішчанку -- за арганізацыю і правядзенне алімпіяды для студэнтаў і старэйшых школьнікаў; дырэктару СШ N27 Е.А.Азяўчыкавай, настаўніку інфарматыкі гэтай жа школы А.М.Філінскаму, Л.С.Ганчар (СШ N 61) -- за арганізацыю і правядзенне на базе СШ N27 алімпіяды па праграміраванню для малодшых школьнікаў; начальніку ІВЦ абласнога ліцэя А.Л.Міняйлавай -- за прадастаўленне дарагой праекцыйнай апаратуры.

Аргкамітэт GCSW'97 пачаў ужо падрыхтоўку да GCSW'98. Чакаем дапамогі і цікавых прапаноў.

**У.АРЛОЎ,**
**дэкан матэматычнага факультэта,**
**М.ДАЛІНСКІ,**
**начальнік ІВЦ.**

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты факультэта фізічнай культуры горача віншуюць аспіранта кафедры АЛФК, выкладчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **СЕЎДАЛЁВА Сяргея Уладзіміравіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.*

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І КУРС ЗАВОЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА на 1997-1998 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

(Заканчэнне. Пачатак на 5 стар.)

чальных устаноў і ПТВ на аснове базавай школы, а таксама выдатнікі ПТВ на аснове сярэдняй школы пры паступленні на спецыяльнасці, якія адпавядаюць атрыманым прафесіям;

-- інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

-- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС".

Універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў звыш плана прыёму на ўмовах дагавораў з аплатай юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. Заключэнне дагавораў ажыццяўляецца пасля правядзення конкурсу.

На месцы звыш плана прыёму, колькасць якіх вызначаецца прыёмнай камісіяй, у першую чаргу залічваюцца абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу. На астатнія месцы залічваюцца абітурыенты па выніках субяседавання па прадметах уступных экзаменаў.

Для атрымання другой вышэйшай адукацыі прымаюцца асобы на ўмовах поўнай аплаты навучання. Парадак залічэння гэтых асоб вызначаецца адпаведным палажэннем.

Паступаючыя ва універсітэт падаюць наступныя дакументы:

-- заяву на імя рэктара;

-- дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале;

-- 6 фотакартак памерам 3 х 4;

-- медыцынскую даведку па форме 086 У /паступаючыя на спецыяльнасць "Фізічная культура і спорт" дадаткова праходзяць медыцынскі агляд у Гомельскім абласным фізкультурным дыспансеры/;

-- выпіску з працоўнай кніжкі /для асоб, якія знаходзяцца на ўліку ў службе занятасці насельніцтва, -- дакумент, які сведчыць аб гэтым/;

-- дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання льготамі;

-- пашпарт /прад'яўляецца ў прыёмную камісію па прыбыцці ва універсітэт/.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104, Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны, прыёмная камісія.

ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.

# ЭКЗАМЕНЫ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

Зыходным палажэннем экзаменаў па плаванню і спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы з'яўляецца вызначэнне ўзроўню агульнафізічнай падрыхтаванасці і рухальнага апарату абітурыентаў.

Здача экзаменаў пачынаецца з іспытаў па плаванню і пры паспяховай здачы абітурыенты працягваюць здаваць іншыя экзамены. Экзамен па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы ўключае нарматывы і патрабаванні спартыўнага шматбор'я, у якім прадугледжана выкананне чатырох абавязковых відаў фізічных практыкаванняў у адпаведнасці з існуючымі правіламі спаборніцтваў.

Вынік кожнага віду фізічных практыкаванняў ацэньваецца ў заліковых балах /гл.табліцу/. У табліцы таксама паказаны нарматывы і патрабаванні па плаванню. Дыстанцыю можна праплыць адным з існуючых стыляў плавання, прадугледжаных спартыўнай класіфікацыяй.

Неабходна адзначыць, што выкананне любога спартыўнага нарматыву чатырохбор'я ніжэй заліковага ацэньваецца двума /"2"/ баламі, якія не з'яўляюцца заліковымі і не ўваходзяць у агульную суму бальнай адзнакі за экзамен.

Такім чынам, адзнака па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы складаецца з сумы вынікаў толькі заліковых балаў, набраных абітурыентам у спартыўным шматбор'і:

ад 18 да 20 балаў -- 5 /выдатна/;

ад 14 да 17 балаў -- 4 /добра/;

ад 10 да 13 балаў -- 3 /здавальняюча/.

Абітурыентам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на плаванне. Так, аналіз вынікаў мінулых гадоў паказвае, што абітурыенты ў асноўным выбіраюць вольны стыль і, такім чынам, не заўсёды паказваюць свае здольнасці ў вывучаных імі стылях плавання. Таму выдзяленне экзамену па плаванню зроблена з мэтай павышэння як агульнага ўзроўню падрыхтаванасці па гэтай дысцыпліне, так і вызначэння эфектыўных спосабаў і стыляў плавання абітурыентамі.

Найбольшыя цяжкасці ў авалодванні нарматывамі і патрабаваннямі па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы адчуваюць абітурыенты, якія дрэнна валодаюць асноўнымі фізічнымі якасцямі -- сілай, хуткасцю, вынослівасцю, спрытнасцю. Гэта ў першую чаргу нарматывы па бегу на 1000 м, кіданню гранаты, гімнастычных практыкаваннях.

Табліца

| Экзамены | Узрост | Нарматыўныя патрабаванні і заліковыя балы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мужчыны | | | жанчыны | | |
| СПЕЦФІЗПАДРЫХТОЎКА | | 5 | 4 | 3 | 5 | 4 | 3 |
| Лёгкая атлетыка: | | | | | | | |
| 1. Бег 100м /сек/ | 17-29 | 12.6 | 13.1 | 13.6 | 14.5 | 15.5 | 16.5 |
| | 30 і болей | 13.0 | 13.5 | 14.0 | 15.0 | 16.0 | 17.0 |
| 2. Бег 1000м /мін,сек/ | 17-29 | 3.05 | 3.10 | 3.20 | 3.52 | 4.10 | 4.30 |
| | 30 і болей | 3.15 | 3.25 | 3.35 | 4.10 | 4.30 | 5.00 |
| 3. Кіданне гранаты /м/ | 17-29 | 48.0 | 44.0 | 38.0 | 32.0 | 27.0 | 22.0 |
| | 30 і болей | 45.0 | 41.0 | 35.0 | 27.0 | 22.0 | 18.0 |
| Гімнастыка: мужчыны -- падцягванне ў вісе на перакладзіне хватам зверху | 17-29 | 15 | 12 | 8 | - | - | - |
| | 30 і болей | 12 | 9 | 6 | - | - | - |
| жанчыны -- згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы /згібанне рук не менш 90°, колькасць разоў/ | 17-29 | - | - | - | 28 | 22 | 14 |
| | 30 і болей | - | - | - | 22 | 18 | 11 |
| Плаванне 100м /мін, сек/ вольны стыль | 17-29 | 1.32 | 1.47 | 2.02 | 1.38 | 1.53 | 2.08 |
| | 30 і болей | 1.42 | 1.57 | 2.12 | 1.48 | 2.03 | 2.18 |
| брас | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.13 | 2.28 | 2.43 |
| кроль на спіне | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 1.53 | 2.08 | 2.23 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |



*Аб папулярным конкурсе*

# ЗА ГАНАРОВЫ ТЫТУЛ

***У гэтага конкурса ёсць ужо свая гісторыя – яму 7 гадоў. З таго часу, як ён упершыню адбыўся ў ГДУ, ён удасканальваўся, набыў новыя грані і адценні і цяпер стаў агульналюбімым для ўсіх студэнтаў. Што гэта так, бачна было па запоўненасці актавай залы.***

...Сем прэтэндэнтаў на званне "Містэр універсітэта - 97" паўсталі на сцэне як сапраўдныя джэнтльмены, якім не займаць розуму, абаяльнасці, настойлівасці, пачуцця гумару. Гардзей Клімаў прадстаўляў эканамічны факультэт, Уладзімір Алдошкін -- гісторыка-юрыдычны, Руслан Сарокін -- фізічны, Дзмітрый Варабей -- біяфак, Дзмітрый Хоміч -- філфак, Віктар Калмагораў -- геолага-геаграфічны, Вячаслаў Тумаш -- матфак. Кожны "прад'явіў" сваю візітную картку: даў сабе кароткую, ёмістую характарыстыку, хто больш сур'ёзна, а хто з добрым гумарам. Асаблівым быў імідж у Р.Сарокіна, які ён стараўся, і не беспаспяхова, утрымліваць на працягу ўсёй конкурснай праграмы -- ён паўстаў у вобразе асобы каўказскай нацыянальнасці.

Па рэкламных плакатах, развешаных у зале, няцяжка было здагадацца, што генеральным спонсарам вечара стала кампанія "Сцімарал". Таму не выпадкова ёй і прысвячаўся першы конкурс на званне "Містэр універсітэта" -- конкурс мастацкіх ідэй. Яго ўдзельнікам трэба было стварыць арыгінальны рэкламны шчыт кампаніі. Найбольш удала гэта заданне атрымалася ў Г.Клімава, за што ён атрымаў каштоўныя падарункі ад спонсара.

Далей усё адбывалася на сцэне па ўзрастаючай. Кожны наступны конкурс быў усё цікавейшым і яшчэ больш відовішчным. Прэтэндэнты на ганаровы тытул выяўлялі свае літаратурныя здольнасці, даючы характарыстыку любімаму і дарослымі, і дзецьмі персанажу -- Віні-Пуху. Тут мацнейшым літаратарам, на думку членаў журы, выкладчыц кафедры рускай літаратуры, аказаўся Вячаслаў Тумаш.

Юнакі дэманстравалі таксама правілы добрага густу і манер, збіраючыся павесці ў рэстаран сваю сяброўку, уласныя гаспадарчыя здольнасці і прыхільнасці пры выбары з меню лепшага не толькі ў г.Гомелі, але і ў нашай рэспубліцы рэстарана "Майдан" найсмачнейшых страў, назвы якіх па арыгінальнасці маглі б паспрачацца з меню рэстаранаў сусветнага ўзроўню. Конкурс быў даволі складаным і справіцца з ім найбольш паспяхова змог толькі Р.Сарокін, за што атрымаў запрашэнне на 2 асобы ў той жа рэстаран "Майдан".

Дамашняе заданне -- тэатральны конкурс развесяліў публіку як ніякі іншы: героі па чарзе аказваліся на бязлюдным востраве ў вобразе Рабінзона Круза. Тут было сапраўднае мора фантазіі і гумару, на што гледачы ў зале рэагавалі надзвычай бурна. Але часам тэатральнае дзейства асобных канкурсантаў "перагружалася" ролямі другога плана, што крыху перашкаджала данесці галоўную сутнасць самога героя. Таму тэатральнае журы аддало перавагу Д.Хомічу, які змог сваёй адточанай да кожнага руху і жэста ігрой паказаць Р.Круза больш дакладна, чым іншыя.

Ці можа звацца сапраўдным джэнтльменам той, хто не ўмее прыгожа танцаваць? Таму апошні конкурс выяўляў здольнасці кожнага юнака менавіта ў гэтым жанры. У каго не хапала дакладнага ўяўлення аб тэхніцы, рытміцы конкурсных танцаў -- лацінаамерыканскага "Ча-ча-ча" і танга "Кумпарсіта", той знаходзіў сваю іх трактоўку, часам вельмі арыгінальную, у чым ім дапамагалі мілыя і абаяльныя партнёршы. Багатая фантазія і цікавая імправізацыя прынеслі ўпэўненую перамогу ў танцавальным марафоне Г.Клімаву.



**Віцэ-містэрам універсітэта сёлета стаў першакурснік фізічнага факультэта Руслан САРОКІН. Прыз яму ўручае лепшы афіцыянт Беларусі 1996 г. студэнт 5-га курса эканамічнага факультэта Юрый Салаўёў.**

Зала з цікавасцю чакала канчатковага прысуду журы. І вось ён вядомы: "Містэрам універсітэта-97" стаў Гардзей Клімаў, а віцэ-містэрам -- Руслан Сарокін.

Прадстаўнік эканамічнага факультэта ўпершыню ў семігадовай гісторыі конкурсу стаў уладальнікам прэстыжнага тытула.

-- Я на перамогу не спадзяваўся, -- прызнаўся мне адразу пасля заканчэння конкурсу Г.Клімаў. -- Калі гаварыць шчыра, я з дзяцінства вельмі нясмелы і нават сарамлівы. Прачытаць на публіку верш было для мяне надта складаным. Але пазней, калі ў старэйшых класах стаў удзельнічаць у школьных мерапрыемствах, гэта ў сабе пераадолеў і стаў нават перамагаць у розных конкурсах. Мне цікава было паўдзельнічаць на пачатку вучобы ў ГДУ ў агульнауніверсітэцкім конкурсе "Ану-першакурснік!", на якім атрымаў званне лаўрэата. Калі рыхтаваўся да "Містэра універсітэта", вельмі мала што пра яго ўяўляў, але тут мне дапамаглі маральна старшакурснікі факультэта, і ў прыватнасці, Д.Бычэнка, многаму змог мяне навучыць і ўдзельнік СТЭМа ГДУ С.Балцэвіч з фізічнага факультэта. Дзякуй ім за гэта!

... Шчодрыя спонсары ўзнагародзілі і пераможцаў, і ўсіх удзельнікаў конкурсу падарункамі, а шматлікім гледачам найлепшай узнагародай у той вечар стаў выдатны настрой.

Т.ДУБЯК.

Фота У.ЧЫСЦІКА.

## ДАЙНЭКА Уладзімір Сямёнавіч



15 сакавіка на 61-ым годзе жыцця раптоўна перастала біцца сэрца кандыдата эканамічных навук, дацэнта кафедры эканамічных тэорый Уладзіміра Сямёнавіча Дайнэкі.

У.С.Дайнэка нарадзіўся ў жніўні 1936 года ў г.Рэчыца ў сям"і рабочых. Яго бацька загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

З 16-ці гадовага ўзросту У.С.Дайнэка працаваў на прадпрыемствах роднага горада, затым на металургічным заводзе ў Данецку.

Пасля службы ў Савецкай Арміі Уладзімір Сямёнавіч паступіў у Маскоўскі дзяржаўны універсітэт на эканамічны факультэт, па заканчэнні якога выкладаў на кафедры палітэканоміі ў Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце. З 1968 па 1971 г. вучыўся ў аспірантуры Белдзяржуніверсітэта. Па заканчэнні яе быў накіраваны на кафедру палітэканоміі нашага універсітэта.

У 1973 г. У.С.Дайнэка паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук. Пасля гэтага яго выбіраюць старшым выкладчыкам, а ў сакавіку 1978 г. -- дацэнтам кафедры палітэканоміі.

За працяглы час работы ва універсітэце У.С.Дайнэка зарэкамендаваў сябе высокакваліфікаваным спецыялістам. Ён прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ГДУ, горада, вобласці. Уладзімір Сямёнавіч вызначаўся прынцыповасцю і сціпласцю, паважлівымі адносінамі да людзей, карыстаўся заслужаным аўтарытэтам. Светлая памяць аб ім надоўга захаваецца ва ўспамінах яго калег і ўсіх тых, каму ён шчодра перадаваў свае веды.

**Група таварышаў.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканаты эканамічнага і філалагічнага факультэтаў, кафедра эканамічных тэорый глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай і раптоўнай смерці кандыдата эканамічных навук, дацэнта **ДАЙНЭКІ Уладзіміра Сямёнавіча** і выказваюць спачуванне яго сям'і і родным.

**ІНФАРМУЕ СЛУЖБА ЗДАРОЎЯ**

## ДЛЯ ПРАФІЛАКТЫКІ СНІДа

На падставе распараджэння Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 02.05.96г. N117 і загада рэктара ГДУ N671 ад 14 кастрычніка 1996 года былі ўнесены ў рабочыя вучэбныя планы для студэнтаў першых курсаў усіх спецыяльнасцей факультатыўныя дысцыпліны па праблеме прафілактыкі СНІДа ў аб'ёме 10 гадзін. Чытанне факультатыўнай дысцыпліны даручана аўтарам гэтых радкоў адпаведна на сямі факультэтах-спецыяльнасцях і на пяці спецыяльнасцях.

Усяго прачытана лекцый і праведзена заняткаў і анкетаванне на 12 патоках першых курсаў для 1000 чалавек. Тэматыка заняткаў строга адпавядала праграме па падрыхтоўцы студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па праблеме ВІЧ-СНІД.

Анкетаванне студэнтаў праведзена двойчы, да пачатку навучання і пасля праслухоўвання курса. У асноўнай сваёй масе, да 85%, студэнты правільна арыентуюцца ў пытаннях ВІЧ-СНІД. Базавыя заняткі яны атрымалі ў сярэдняй школе. У канцы анкеты студэнты пісалі свае пажаданні. Асноўны іх пералік прыводзім:

1) стварыць ва універсітэце цэнтр па праблеме ВІЧ-СНІД, дзе можна было б атрымаць кансультацыю ў любы час;

2) усіх студэнтаў абследаваць на ВІЧ-СНІД;

3) прапаганду праводзіць пастаянна, але не патокамі, а па невялікіх групах, па 15-20 студэнтаў, каб была магчымасць задаць любыя пытанні без узнікнення смеху ў зале;

4) бясплатна выдаваць ва універсітэцкім цэнтры СНІДа прэзерватывы;

5) развесіць па ўсіх карпусах і інтэрнатах універсітэта яркія плакаты па праблемах ВІЧ-СНІД;

6) гарадскому цэнтру па прафілактыцы СНІДа адзін раз у месяц даваць інфармацыю для публікацыі ў газеце "Гомельскі універсітэт" па сітуацыі ВІЧ-СНІД;

7) калі ВІЧ перадаецца ад хворага чалавека, студэнты пытаюць: чаму ж гэта захворванне не заразнае?;

8) у большасці студэнтаў узнікае таксама пытанне, чаму немагчыма атрымаць ВІЧ праз насякомых, якія смокчуць кроў? Ім патрэбна дакладнае абгрунтаванне, а не проста адказ;

9) з бацькамі ніхто такімі праблемамі не дзеліцца, з сябрамі -- рэдка, таму і хочуць мець свой даверны цэнтр ва у іверсітэце або тэлефон даверу;

10) газету "СПИД-Инфо" трэба прадаваць студэнтам з 50-працэнтнай скідкай, або мець такія газеты ў чытальных залах бібліятэкі універсітэта, на кафедрах, у медпункце, у прафілакторыі, у інтэрнатах, у прафкоме;

11) усе жадаюць, каб хвароба стала хутчэй вылечваемай;

12) па мясцоваму, Гомельскаму тэлебачанню або па "Нірэі" адзін раз у тыдзень даваць інфармацыю па ВІЧ-СНІДу з паказам сімптомаў, сіндромаў СНІД і ВІЧ інфіцыраванасці.

**С.ЗАЛАТЫХ,**
**галоўны урач прафілакторыя ГДУ,**
**Н.КАРТАШОВА,**
**дацэнт кафедры АЛФК.**

## ФИЛОСОФСКИЕ НАБЛЮДЕНИЯ

*Мир тесен -- в нем слишком много узких мест.*

◆◆◆

*Выйдя из себя, нельзя войти в положение другого.*

◆◆◆

*Посмотрев правде в глаза, иные отводят глаза в сторону.*

◆◆◆

*Чтобы стать лучше других, надо сначала быть как все.*

◆◆◆

*Это не жизнь уходит, это мы от нее отстаем...*

◆◆◆

*Многие великие открытия когда-то были просто заблуждениями.*

◆◆◆

*Каждое правило гордится своими исключениями.*

◆◆◆

*Чем значимее оригинал, тем многочисленнее копии.*

◆◆◆

*За словом в карман лезут разве что на экзаменах.*

◆◆◆

*Земля наша грешная. Но сколько райских уголков!*

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 100.
Падпісана да друку 21.03.97.